**Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка**
**Аддзел бібліятэчнага маркетынгу**

**Хроніка**
**культурнага жыцця бібліятэк г. Кобрына і раёна за студзень 2016 г.**

**<u>Мерапрыемствы да Году Культуры</u>**

17 студзеня

Інфармацыйна-пазнавальная гадзіна «Дорогами православной Беларуси», прымеркаваная да 915-годдзя з дня нараджэння Еўфрасінні Полацкай, сабрала ў бібліятэцы членаў клуба сямейнага чытання "Берегиня". Увазе прысутных прадстаўлена кніжная выстаўка «Пад зоркай Еўфрасінні», прапанаваны спіс выданняў гэтай тэматыкі. У канцы мерапрыемства чыталіся любімыя вершы беларускіх паэтаў, прысвечаныя заступніцы зямлі беларускай.

Шамятоўская СБ, 16 чал.

20 студзеня

Год культуры ў бібліятэцы адкрыўся Каляднымі сустрэчамі «Однажды в сочельник», які арганізавалі члены клуба «Залатыя гады». Удзельнікі мерапрыемства нанова перагледзелі і адкрылі сэнс традыцый і сімвалаў Ражства. З дапамогай відэаролікаў госці акунуліся ў гісторыю гэтага свята і даведаліся, як адзначаюць яго ў розных краінах свету і ў Беларусі. Гасцям прапанаваны вясёлыя гульні, конкурсы, музычныя віншаванні, калядныя прадказанні.

ЦБ, 50 чал.

22 студзеня

Круглы стол «Бібліятэкі ў Год культуры: рэсурсы, магчымасці, перспектывы», удзельнікамі якога сталі бібліятэкары ДУК «Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма». У рамках мерапрыемства разглядаліся пытанні планавання дзейнасці бібліятэк у Год культуры, адбыўся абмен сваімі напрацоўкамі сярод сельскіх бібліятэкараў. Метадысты прадставілі віртуальную кніжную выставу, прысвечаную юбілеям беларускіх кніг «Беларускія творы святкуюць юбілей» і электронную прэзентацыю «Культурны марафон даўжынёю ў год» у дапамогу рабоце бібліятэк у Год культуры.

ЦБ, 55 чал.

26 студзеня

Літаратурная сустрэча «Галасы зямлі Берасцейскай», прысвечаная 10-годдзю з часу ўтварэння Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Гасцямі мерапрыемства сталі старшыня Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Анатоль Крэйдзіч і члены грамадскага літаратурнага аб'яднання Анатоль Брытун, Міхась Кулеш, кабрынчане Наталля Касцюк, Вячаслаў Бурдыка. Падрыхтавана відэапрэзентацыя «Галасы зямлі Берасцейскай», выстава-панарама «На літаратурным Парнасе Берасцейшчыны». На мерапрыемстве прысутнічалі

настаўнікі беларускай мовы і літаратуры горада і раёна, літаратары Кобрыншчыны, бібліятэчныя работнікі, іншыя аматары літаратуры. Бібліятэцы падараваны кнігі членаў Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі з аўтографамі аўтараў, а таксама іншая інфармацыя аб літаратурным аб'яднанні.

ЦБ, 48 чал.

**Мерапрыемствы да Навагодніх свят і Ражства**

5 студзеня

З пачатку года дзіцячая бібліятэка сумесна з інспекцыяй па справах непаўналетніх г. Кобрына пачыла цыкл мерапрыемстваў для дзяцей і падлеткаў з сем'яў сацыяльна – небяспечнага становішча пад дэвізам «Будзем з кнігамі сябраваць». Першае мерапрыемства прайшло пад назвай «Час калядных дзіваў». Дзеці праглядзелі лялечны спектакль «Навагодняя прыгода казачных герояў» і прынялі ўдзел у конкурса-гульнёвай праграме «Азбука деда Мароза». Мерапрыемства скончылася салодкім чаяпіццем і ўручэннем навагодніх гасцінцаў.

ДБ, 16 чал.

11 студзеня

Стрыгаўскай бібліятэкай і цэнтрам культуры і вольнага часу праведзены рэтра-вечар «Зажги свечу на Рождество». Увазе гледачоў бібліятэкар прадставіла кніжную выставу «Святло Каляд». Ўдзельнікі дзіцячай вакальнай групы «Зорачкі», кружка мастацкага слова і літаратурна-паэтычная група «Ліра» падрыхтавалі песні і вершы каляднай тэматыкі. Пажылыя наведнікі прымалі актыўны ўдзел у свяце: успаміналі традыцыі святкавання Каляд, чыталі вершы, адказвалі на пытанні віктарыны, расказвалі пра калядныя забавы. Падчас інтэрв'ю пажылыя людзі з задавальненнем дзяліліся добрымі і цікавымі падзеямі года. Самыя актыўныя ўдзельнікі атрымалі прызы з каляднага мяшка.

Стрыгаўская СБ, 40 чал.

11 студзеня

Забаўляльная праграма «Необычная экспедиция по новогодним традициям» для вучняў 2 – 5 класаў. Дзеці з задавальненнем расказвалі свае маленькія традыцыі святкавання Новага года ў сям'і і пазналі, як адзначаюць Новы год у Францыі, Германіі, Кітаі, ЗША, Афрыцы і Расіі. З вялікім задавальненнем дзеці бралі ўдзел у конкурсах «Весёлая чепуха», «Снежкі», у гульнях «Вясёлая эстафета», «Хто далей скокне», «Самы спрытны», актыўна дэкламавалі вершы і спявалі песні. Не абыйшлося свята і без вясёлага карагода.

Гарадзецкая СБ, 18 чал.

14 студзеня

Святочны настрой падарылі працаўнікі Навасёлкаўскай сельскай бібліятэкі і Дома культуры ўдзельнікам каляднай мазаікі «Пришли святки к нам на колядки». Бібліятэкар прадставіла кніжную выставу «Разам з кнігай у Новы год». Гледачы паглядзелі выступленне вакальнай групы «Навасёлачка»

і дзіцячай вакальнай групы. Асаблівую атмасферу вечару надала рэтра-дыскатэка і калядныя пачастункі.

Навасёлкаўская СБ, 50 чал.

14 студзеня

У рамках святочнай праграмы вечара «Вось і зноў Каляды, сіл нябесных ўрачыстасць» літаратурна-паэтычная група «Натхненне» бібліятэкі прадставіла літаратурна-музычную кампазіцыю «Пусть в Рождество здоровье, радость и добро сумеют в вашем доме поселиться». Цёпла сустрэлі гледачы паэтычную замалёўку «Чудесною сказкой наполнится дом в Рождество». З вялікай цікавасцю прысутныя знаёміліся з каляднымі прыметамі, актыўна разгадвалі калядныя загадкі.

Гарадзецкая СБ, 40 чал.

16 студзеня

«Вясёлыя святкі» - так называўся цыкл фальклорных вячорак, якія прайшлі ў сельскай бібліятэцы. Бібліятэкар падрыхтавала кніжную выставу «Ясны свет Каляды». У ходзе мерапрыемства ўдзельнікі азнаёміліся з гісторыяй Старога новага года, актыўна адказвалі на пытанні віктарыны «Гісторыя Калядаў».

Батчынская СБ, 18 чал.

18 студзеня

У рамках святочнай праграмы «В лучах Рождественского света» дзіцячы аматарскі клуб «Крынічка» прадставіў літаратурна-музычную кампазіцыю «Счастливая сиротка» па апавяданні Л. Жохава «Мирская захребетница». Дзіцячы і дарослы хор Петра-Паўлаўскай царквы, парадавалі гледачоў каляднымі спевамі. Павіншаваўшы ўсіх са святамі, настаяцель храма айцец Сергій ўрачыста завяршыў вечар.

Залеская СБ, 150 чал.

## Іншыя мерапрыемствы

12 студзеня

Гадзіна прававой культуры «Як стаць упэўненым у сабе. Абарона правоў непаўналетніх» праводзілася на пасяджэнні аматарскага клуба «Ровесник». Падлеткі пазнаёміліся з асноўнымі нарматыўнымі дакументамі, якія абараняюць іх правы, даведаліся, калі наступае адказнасць за садзеяныя ўчынкі. У канцы ўручаны памяткі «Як стаць упэўненым у сабе».

Лукская СБ, 12 чал.

13 студзеня

На гадзіну цікавых павядамлянняў «Казаць дзякуй – гэта прыемна», прымеркаваную да Сусветнага дня «Спасибо», сабраліся вучні Павіццеўскай школы. На мерапрыемстве дзеці ўспаміналі ветлівыя словы, адгадвалі загадкі, вучыліся правільна выходзіць з нестандартных сітуацый, чыталі вершы. Найбольш актыўныя дзеці ўзнагароджаны прызамі.

Павіццеўская СБ, 15 чал.

21 студзеня

З 14 студзеня 2016 стартаваў першы этап новай рэкламнай акцыі аддзела маркетынгу Кобрынскай цэнтральнай раённай бібліятэкі - рэклама «На колёсах». Заключаны дагавор з філіялам ААТ «Брестоблавтотранс» «Аўтамабільны парк № 16 г. Кобрына» аб размяшчэнні рэкламы аб бібліятэчных паслугах. З гэтага дня практычна кожны пасажыр г. Кобрына азнаёміцца з ёй у салонах гарадскіх аўтобусаў на самых розных маршрутах.

ЦБ

24 студзеня

Пасяджэнне аматарскага клуба «Друг, который может стать врагом» прысвечана пытанням аб уздзеянні камп’ютара на здароўе чалавека. У ходзе мерапрыемства вучні абмеркавалі тэрмін «здароўе», назвалі шкодныя фактары уплыву камп’ютара, падзяліліся саветамі для правільнай працы за камп’ютарам. У канцы пасяджэння праведзена анкетаванне ўдзельнікаў клуба.

Астроміцкая СБ, 15 чал.

30 студзеня

Актыўную ўвагу чытачоў прыцягнуў фотапраект бібліятэкі «Аднавяскоўцы раяць прачытаць». На выставе размешчаны партрэты аўтарытэтных аднавяскоўцаў з кнігамі, якія яны прапануюць прачытаць.

Залеская СБ

## <u>**Выдавецкая дзейнасць**</u>

Бібліёграфамі цэнтральнай раёнай бібліятэкі выдадзены бягучы бібліяграфічны паказальнік «Новая літаратура аб Кобрыне і Кобрынскім раёне за 2015 год». У паказальнік уключаны кнігі і артыкулы з часопісаў і газет за 2015 год. У канцы паказальніка размешчаны геаграфічны паказальнік, спіс перыядычных выданняў, якія выкарыстаны пры складанні дапаможніка.

ЦБ

Аддзелам бібліятэчнага маркетынгу падрыхтавана віртуальная кніжная выстава, прысвечаная беларускім кнігам "Беларускія творы запрашаюць на юбілей".

ЦБ

Супрацоўнікамі аддзела бібліятэчнага маркетынгу падрыхтавана электронная прэзентацыя «Культурный марафон длиною в год» у дапамогу рабоце бібліятэк у Год культуры.

ЦБ

Выканаўца Міхейкіна-Белякова А. М.
Тэл. 2 36 81